**З 10 мая ў кальцавой галерэі 3-га паверха Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе выстава «Чараўнік з краіны маленства», прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра.**

Педагог, рамантык, чараўнік, мысліцель, гуманіст, вандроўнік, шукальнік, чалавек з крылатай фантазіяй – такія грані творчага партрэта Янкі Маўра раскрываюцца ў экспазіцыі праз кніжныя выданні, часопісныя публікацыі, энцыклапедычныя і навукова-папулярныя выданні, а таксама ілюстрацыйны матэрыял з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.




Пачынаецца выстава з раздзела «Педагог. Вандроўнік. Летуценнік». Цэнтральнае месца ў ім адведзена адзінаму аўтабіяграфічнаму твору Янкі Маўра – аповесці «Шлях з цемры» (1920 – 1957). Вельмі важнай старонкай біяграфіі Янкі Маўра з'яўляецца жыццё ў эвакуацыі пад час Вялікай Айчыннай вайны. Пісьменнік стаў адным з ініцыятараў стварэння і рэдактарам кнігі ўспамінаў дзяцей, якія перажылі вайну, – «Ніколі не забудзем», што выйшла ў 1948 г.

На выставе прадстаўлены выданні розных твораў Янкі Маўра: «Чалавек ідзе» (1927),

«Сын вады: аповесць з жыцця на Вогненнай Зямлі» (1928), «У краіне райскай птушкі» (1928), «Амок» (1930), «Палескія рабінзоны» (1930), «Слёзы Тубі» (1930), «ТВТ» (1934) і інш. Асаблівую цікавасць уяўляюць кнігі з аўтографам *«у скарбніцу нашу, Беларускую дзяржаўную бібліятэку імя Леніна – ад аўтара»*.

Сярод адметнасцей выставы – мемарыяльныя рэчы Янкі Маўра: пісьмовы набор, шахматы, гальштук, калекцыя марак з лістоў і паштовак ад эсперантыстаў з усяго свету. Дапаўняюць і ўзбагачаюць выяўленчы матэрыял лічбавыя копіі важных дакументаў, аўтографаў, фотаздымкаў, якія даюць больш поўнае ўяўленне пра асобу пісьменніка.

Навігатарам па экспазіцыі з'яўляюцца словы-ўспаміны блізкіх і сяброў Івана Фёдаравіча, што раскрываюць розныя грані яго характару, пэўныя жыццёвыя сітуацыі і цікавыя здарэнні. Кожны чытач і наведвальнік бібліятэкі мае магчымасць адчуць «аўру Маўра» і прысвяціць свой адпачынак знаёмству з добрай, шчырай і праўдзівай кнігай аўтара – чараўніка і вандроўніка.

Выстава будзе працаваць па 31 снежня.